# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 11 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.**

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| *карцеч* | Артылерыйскі снарад, начынены круглымі кулямі, буйны шрот | *ж. р.* |
| *лотаць* | Шматгадовая травяністая расліна з жоўтымі кветкамі, якая расце на балотах, берагах сажалак | *ж. р.* |
| *сенажаць* | Травастой; месца, дзе расце трава на сена; луг | *ж. р.* |
| *сажань* | Адзінка меры даўжыні, якая ўжывалася да ўвядзення метрычнай сістэмы мер | *м. р.* |
| *дроб* | Лік, які складаецца з пэўнай колькасці роўных частак адзінкі | *м. р.* |
| *папараць* | Шматгадовая травяністая расліна з буйнымі рассечанымі або складанымі лістамі, якая расце ў цяністых вільготных месцах | *ж. р.* |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 2.**

| Словы без суфікса | Словы з нулявым суфіксам | Словы з адным матэрыяльна выражаным суфіксам | Словы з двума матэрыяльна выражанымі суфіксамі |
|---|---|---|---|
| дуброва | аб’езд | (паехаць) вечар-ам | абазв-а-ць |
| лаўлю | даўгагрывы | адраз-у | |
| абоі | буралом | вясен-н-і | |
| вазон | зноў | | |

*За кожны правільны адказ (улічваецца месца слова і правільнасць вызначэння суфікса) – 0,5 бала.*

**Заданне 3.**

| | | |
|---|---|---|
| *зямля* | ***праходзіць*** | ***землепраходзец*** |
| *ікона* | ***пісаць*** | ***іканапіс*** |
| *новы* | ***утварыць*** | ***новаўтварэнне*** |
| *свет* | – | – |
| *святло* | ***маскіраваць*** | ***святломаскіроўка*** |
| *той* | ***час*** | ***тагачасны*** |
| *чорны* | ***зямля*** | ***чарназём*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал. За лішняе (сёмае) слова адымаецца 0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| Злітнае напісанне | Напісанне праз дэфіс |
|---|---|
| *каменнавугальныя адклады* | *азёрна-ледавіковая слаістая гліна* |
| *мелкаводны марскі басейн* | *вулканагенна-асадкавая тоўшча* |
| *геаструктурныя элементы* | *Заходне-Еўрапейская платформа* |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 5.**

| Прыклады | Трэцяе лішняе (нумар) | Тлумачэнне |
|---|---|---|
| *I. Простыя і складаныя сказы:*<br>1) Сяргей стаяў пад бярозамі і любаваўся гэтымі знаёмымі, але сёння чамусьці асабліва ўрачыстымі і светлымі мясцінамі і ўсміхаўся сам сабе (А. Варановіч).<br>2) У Карэліцкім раёне, што на Гродзеншчыне, геолагі знайшлі жалезную руду (М. Шыманскі).<br>3) Насустрач хмары паплылі, і стала ўраз цямней (А. Бачыла). | 1 | 2 і 3 – складаныя сказы;<br>1 – просты сказ |
| *II. Від складанага сказа:*<br>1) Мне было сцюдзёна пасля хваробы, аднак я пайшоў, і хадзіў доўга, і на хваробу сваю забыўся (М. Гарэцкі).<br>2) Хоць не было спякоты, але так і вабіла пад засень дрэў, каб пасядзець там хвіліну-другую (У. Шахавец).<br>3) Я вярнуўся сюды, дзе праводзіла ў свет мяне маці, дзе я першую радасць і смутак маленства пазнаў (Р. Няхай). | 1 | 2 і 3 – складаназалежныя сказы;<br>1 – складаназлучаны сказ |
| *III. Від даданай часткі:*<br>1) Каб перайсці цераз ручай, мне давялося зламаць на падпорку даволі тоўстую, але зусім сухую асінку (У. Караткевіч).<br>2) Параіўшыся, [Алесь] прыняў рашэнне, каб у капанні катлавана дапамог і тол (П. Броўка).<br>3) Кожны з нас прыпасае Радзімы куток, каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны… (П. Панчанка). | 2 | 1 і 3 часткі – даданыя акалічнасныя мэты;<br>2 – даданая азначальная |

| | | |
|---|---|---|
| *IV. Сінтаксічная функцыя злучальнага слова:*<br>1) Я не ведаю, з чым зраўняецца радасць дотыку да зямлі (П. Макаль).<br>2) На тэрыторыі Беларусі пашыраны разьба па дрэве і разьба па косці, апошняя з якіх вядома з часоў позняга палеаліту (Я. Сахута).<br>3) На Беларусі існавала шмат спосабаў, магічных прыёмаў, якімі карысталіся сяляне пры выбары месца пад хату (Л. Лыч). | 2 | 1 і 3 – злучальнае слова з'яўляецца дапаўненнем;<br>2 – злучальнае слова ўваходзіць у склад дзейніка |

*За кожнае правільнае вызначэнне нумара трэцяга лішняга – 0,5 бала, за кожнае правільнае тлумачэнне – 1 бал.* ***Выяўленне трэцяга лішняга і, адпаведна, абгрунтаванне павінны рабіцца выключна зыходзячы з названых умоў.***

**Заданне 6.**

| | | |
|---|---|---|
| *захварэць* | ‘пачаць весці сябе высакамерна, фанабэрыста, выяўляючы нечаканыя звычкі, імкненне да раскошы і пад.’ | ***захварэць на пана*** |
| *трапляць* | ‘аказвацца ў цяжкім, небяспечным ці непрыемным становішчы’ | ***трапляць у пераплёт*** |
| *пісаць* | ‘хто-н. вельмі добры ва ўсіх адносінах’ | ***хоць ікону пішы*** |
| *прапускаць* | ‘знарок не звяртаць увагі на што-н., не надаваць значэння чаму-н.’ | ***прапускаць паміж пальцамі*** |
| *прыводзіць* | ‘ліквідуючы адрозненні, ураўноўваць што-н. у якіх-н. адносінах’ | ***прыводзіць да агульнага назоўніка*** |
| *спяваць* | ‘не маючы ўласных перакананняў, выконваць чужую волю, паўтараючы раней сказанае іншымі’ | ***спяваць з чужога голасу*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Увайшоў малады чалавек гадоў дваццаці пяці, выпрамяняючы (выпраменьваючы) здароўе *(уражваючы здароўем – і інш.)*, з усмешкай на шчоках, вуснах і вачах. Зайздрасць брала глядзець на яго. Ён быў прычасаны *(прычэсаны)* і адзеты *(апрануты)* бездакорна, асляпляў свежасцю твару, бялізны, пальчатак і фрака. Па камізэльцы ляжаў далікатны *(зграбны, элегантны)* ланцужок, з мноствам драбнюткіх бірулек. Ён дастаў танюсенькую *(найтанчэйшую)* батыставую хустачку, удыхнуў водары Усходу, потым нядбайна правёў ёй *(ёю)* па твары, па глянцавітым капелюшы і абмакнуў лакіраваныя боты.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| № п.п. | Сцверджанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Гэта ўзор сентыменталізму | | + |
| 2 | Гэта твор у межах напрамку барока | | + |
| 3 | Паэма напісана 4-стопным харэем | | + |
| 4 | Паэма напісана 5-стопным ямбам | | + |
| 5 | Ва ўрыўку ёсць парушэнні вершаванага памеру (стопы, якія не маюць націску) | + | |
| 6 | У фрагменце выкарыстаны толькі мужчынскія рыфмы | | + |
| 7 | У фрагменце выкарыстаны толькі жаночыя рыфмы | | + |
| 8 | У фрагменце адсутнічае рыфмоўка | | + |
| 9 | Асаблівасцю гэтага ўрыўка з’яўляецца выкарыстанне анафары | | + |
| 10 | У апошняй страфе ўрыўка выкарыстаны эпітэт | + | |
| 11 | Сярод іншых сродкаў мастацкай выразнасці аўтар выкарыстаў параўнанне | + | |
| 12 | Стары баярын жыў у сваім прыгожым палацы, абсаджаным стагадовымі ліпамі | | + |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**



Гэта **<u>Іван Мележ</u>**

Ён аўтар наступных твораў: **<u>4, 9</u>**



Гэта **<u>Янка Брыль</u>**

Ён аўтар наступных твораў: **<u>1, 5, 7</u>**



Гэта **<u>Аркадзь Куляшоў</u>**

Ён аўтар наступных твораў: **<u>2, 8</u>**

?

Гэтыя творы не належаць ніводнаму з прадстаўленых на партрэтах пісьменнікаў: **<u>3, 6</u>**

*За кожны правільны подпіс партрэта – 0,5 бала; за кожнае правільнае вызначэнне месца назвы твора – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка за заданне складаецца з трох кампанентаў: правільнасці вызначэння назвы твора і яго аўтара, ацэнкі выбару эпізодаў з тлумачэннем выбару і ацэнкі закадравага тэксту.*

*За правільнае вызначэнне назвы твора (“Хто смяецца апошнім”) – 0,5 бала, аўтара (Кандрат Крапіва) – 0,5 бала.*

*За кожны эпізод з тлумачэннем – 0,5 бала.*

*Закадравы тэкст:*

| *Крытэрый* | *Колькасць балаў* |
|---|---|
| *Прадстаўленне асноўных герояў (не менш за 3)* | *1* |
| *Тлумачэнне гледачу, пра што фільм* | *1* |
| *Захаванне інтрыгі* | *0,5* |
| *Сувязь тэксту з выбранымі эпізодамі* | *0,5* |
| *Колькасць слоў у тэксце, не большая за 200* | *0,5* |